
НАВІНКІ КНІГАВЫДАННЯ



ДЭБЮТ ПАЭТЭСЫ Ў ПРОЗЕ

Віншаванні з выхадам новай кнігі прымае член СПБ, беларуская паэтка з Гродна Вольга Алізар. Чарговая работа, зборнік апавяданняў і эсэ пад назвай «Вуліца Дружбы» (Мінск, «Белпрінт», 2026) – дэбют пісьменніцы ў прозе.

У анатацыі да кнігі гаворыцца: *«Жыццёвы шлях кожнага чалавека напоўнены самымі рознымі гісторыямі і прыгодамі. Адны з іх выліваюцца ў вершы, другія – у апавяданні і эсэ. Кніга «Вуліца Дружбы» – гэта зборнік, пад вокладкай якога сабраліся розныя людзі, розныя ўчынкі і розныя пачуцці. Але агульнае, што аб'ядноўвае іх, – гэта бязмежная любоў да жыцця і моцная павага да кожнага чалавека».*

Змест зборніка апавяданняў і эсэ Вольгі Алізар «Вуліца Дружбы» складаецца з твораў: «Вуліца для шпакоў»; «Сукенка»; «Бацькоўская доля»; «Сыноўні падман»; «Зялёнка»; «Бярозка»; «Ролтан»; «Бацькава любоў»; «Чужых дзяцей не бывае» і інш. У раздзеле «Апавяданні» налічваецца 20 твораў, у «Эсэ» – 11. У кнізе 96 старонак. На тыльным баку вокладкі кнігі змяшчаюцца кароткая творчая біяграфія пісьменніцы і яе каляровы фотапартрэт. Ілюстрацыі выканала дачка пісьменніцы Валерыя. Пераплёт мяккі. Тыраж 99 экзэмпляраў. Рэдактар выдання Т. К. Цвірко. Паліграфічнае выкананне – Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Белпрінт» (Мінск, 2026).

У хуткім часе новая кніга члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэсы, празаіка Вольгі Алізар (Гродна) з'явіцца ў бібліятэках краіны.

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ